УДК 811.161.1+811.161.3'373.21

Л. А. ГАДУЙКА

САЦЫЯЛІНГВІСТЫЧНАЯ МАРКІРАВАНАСЦЬ ЭРГАНІМІІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ НАЗВАЎ ТВОРЧЫХ АБ'ЯДНАННЯЎ БРЭСТЧЫНЫ)

Уласнае імя ўяўляе сабой і моўны, і сацыяльны знак. Ён дэманструе ўспрыманне чалавекам сусвету і пэўным чынам пазнанне апошняга, адлюстроўвае функцыянаванне мовы ў соцыуме, жыва рэагуе на ўсе з'явы ў навакольным асяроддзі і ў выніку аказваецца нявольным рэгістратарам рэалій прыроды і грамадскіх падзей [1]. Таму заканамерна, што анімія, асобныя яе разрады разглядаюцца сучаснай навукай аб мове ў аспекце не толькі лінгвістычным, але і кагнітыўным, лінгвагеаграфічным, лінгвакультуралагічным, псіха-, прагма-, сацыялінгвістычным [2–17] і інш.

Мы звярнуліся да аднаго фрагмента рэгіянальнага анамастыкона – да намінацый творчых калектываў г. Брэста, Брэсцкага, Бярозаўскага, Камянецкага, Маларыцкага раёнаў (уласныя імёны дзелавых аб'яднанняў абазначаем тэрмінам «эргонім» [18]). Зварот да разнастайных інтэрнэт-крыніц дазволіў зафіксаваць больш за 250 падобных адзінак. Сярод іх увагу прыцягваюць назвы з выразна прадстаўленым прапрыяльным кампанентам (ён падаецца ў двукоссі або без яго, толькі лацінкай, што назіраем апошнім часам у публіцыстычных тэкстах), які адрозніваецца большай індывідуальнасцю, меншай фармалізаванасцю, чым родавы кампанент тыпу *ансамбль*, *вакальная група* / *вокальная группа*. Абраныя штучныя намінацыі аб'ектывуюць шматлікасць прынцыпаў, спосабаў, прыёмаў прысваення ўласнага імя, даюць цікавую экстралінгвістычную, у т.л. сацыялінгвістычную, інфармацыю (сацыялінгвістыка вывучае шырокі

комплекс праблем, звязаных з сацыяльнай прыродай мовы, яе грамадскімі функцыямі, механізмам уздзеяння аб'ектыўных фактараў на мову і яе роллю ў жыцці грамадства [19]). Такім чынам, прадмет нашага даследавання – адлюстраванне ў эрганіміі сацыяльнай дыферэнцыяцыі мовы, асаблівасцей моўнай сітуацыі на Брэстчыне і ў цэлым у Беларусі.

Моўную сітуацыю фарміруюць функцыянальныя адносіны паміж кампанентамі сацыяльна-камунікатыўнай сістэмы на пэўным этапе яе існавання [20]. Важны складнік моўнай сітуацыі – **карэляцыя моў**, якімі карыстаецца соцыум. У нашай выбарцы прадстаўлены эргонімы на дзвюх дзяржаўных мовах (у рэальным ужыванні прычым побач з найменнямі, якія цалкам падаюцца па-беларуску або па-руску, адзначаюцца і напісанні, у якіх родавы і прапрыяльны кампаненты належаць да розных моўных сістэм).

У цэлым сярод зафіксаваных назваў творчых калектываў дамінуюць рускамоўныя эргонімы: *кукольный кружок* ***«Цветик-семицветик»***; *танцевальный кружок* ***«Капель»***; *народный клуб авторской песни* ***«Перекрёсток»***; *народный клуб творческой молодежи* ***«Свой круг»***; *фольклорный ансамбль* ***«Ладушки»***; *женский вокальный ансамбль* ***«Нежность»***; *вокальная группа народной песни* ***«Мельница»***; *хореографический кружок* ***«Юла»***; *группа* ***«Растение мудрости»*** (калектыў, па словах музыкантаў, «*прарос*» у 2006 г. на землях Палесся. «І вось ужо шмат гадоў гэта мудрая *расліна*… дорыць свае чарадзейныя плады ўсім, хто гатовы адкрыць сваё сэрца для Любові і Дабра»); *ансамбль скрипачей* ***«Поющие смычки»*** і інш. Найменне *рок-группа* ***«Садъ»*** дэманструе такую тэндэнцыю ў эрганіміі, як фарміраванне своеасаблівага рэтрастылю праз зварот да літар дарэвалюцыйнага рускага алфавіта. Як успамінае лідар калектыву, з'яўленне «ера» спачатку было спантанным («проста так больш падабалася… прыдавала індывідуальнасць назве»), а потым дапамагло ў адрозненні ад украінскай групы-цёзкі і зрабіла эфектыўным інтэрнэт-пошук інфармацыі пра калектыў (а не «пра дрэвы і дзіцячыя садкі»); да таго ж

у 2019 г. пасля аднаўлення ў Брэсце рэтрасаду XIX ст. (на памятным валуне ў яго цэнтры чытаем «Городской *садъ*»), уласнае імя творчага аб'яднання напоўнілася новымі культурнымі, сацыяльнымі сэнсамі.

Шэраг эргонімаў функцыянуе на абедзвюх, беларускай і рускай, мовах: *народны інструментальны ансамбль* ***«Настрой»*** / ***«Настроение»***; *народны ансамбль песні* ***«Славія»*** / ***«Славия»***; *узорная тэатральная студыя* ***«Чароўны ліхтар»*** / ***«Волшебный фонарь»***; *народны ансамбль музыкі і песні* ***«Астрамечаўскія Лявоны»*** / ***«Остромечевские Лявоны»*** (творчае аб'яднанне плённа працуе на базе ДК у в. *Астрамечава*) і інш. Некаторыя назвы калектываў або пішуцца і гучаць аднолькава ў аналізуемых блізкароднасных моўных сістэмах (*народная мужчынская вакальная група* ***«Кронан»*** – у якасці эргоніма абрана старажытная назва р. Нёман; *узорны ансамбль гарманістаў* ***«Картузяне»***; *народны інструментальны ансамбль* ***«Экспромт»***; *народны тэатр-студыя* ***«Раёк»***; *кавер-група* ***«БаянДай»*** і інш.), або нязначна адрозніваюцца сваім фанетычным і/ці графічным абліччам, што, думаецца, спрашчае бытаванне ўласнага імя ва ўмовах афіцыйнага білінгвізму: *тэатр песні і танца*, *народны хор* ***«Вяснянка»*** (рус. *веснянка*); *народны фальклорна-этнаграфічны калектыў* ***«Васілёчак»*** (рус. *василёчек*); *образцовый ансамбль эстрадного танца* ***«Ассорти»*** (бел. *асарці*); *вокальные ансамбли* ***«Бэби-бум»*** (бел. *бэбі-бум*), ***«Весёлые нотки»*** (бел. *вясёлыя ноткі*); *образцовый ансамбль эстрадного танца* ***«Престиж»*** (бел. *прэстыж*); *народная театральная студия* ***«Слово»*** (бел. *слова*); *оркестр народных инструментов* ***«Белояр»*** (бел. *Белаяр*; эргонім адсылае да імя славянскага бога Сонца); *вокальный кружок* ***«ДоРеМишки»*** (назва ўяўляе сабой вынік аказіянальнага словаўтварэння і ўдала ўказвае на ўзрост, інтарэсы ўдзельнікаў калектыву і яго прыхільнікаў) і інш.

Прапрыяльныя найменні на тытульнай нацыі прадстаўлены ў меншай ступені (адзначым іх трапнасць, мілагучнасць, сувязь з нацыянальнымі культурнымі кодамі): *узорны хор* ***«Ветразь надзеі»***; *вакальная студыя*

«Забаўлянкі»; *узорная студыя* ***«Папяровыя дзівосы»***; *узорны інструментальны ансамбль* ***«Астрамечаўскія жаўрукі»***; *дзіцячы фальклорны калектыў* ***«Жаўручкі»***. Апошнія два эргонімы аб'ектывуюць арнітаморфны код беларускай культуры (*жораў* з'яўляецца важным прадстаўніком мясцовай прыроды і вобразам народнай міфалогіі: ён сімвалізуе дабрабыт, успрымаецца боскім пасланцам). Увогуле, падобныя намінацыі найбольш тыповыя для творчых аб'яднанняў, якія працуюць у народным, традыцыйным накірунках: *народнае аматарскае аб'яднанне* ***«Камянецкая скарбонка»***; *народны ансамбль народных інструментаў* ***«Камянецкія музыкі»***; *народны ансамбль народнай песні* ***«Рыцкі куфэрак»***; *узорны ансамбль народнага танца* ***«Праменьчык»***; *народны вакальны ансамбль* ***«Рамонкі»***; *раённы клуб майстроў-умельцаў* ***«Скарб талентаў»***; *народны хор ветэранаў* ***«Крыштальныя крыніцы»***; *калектыў народнага танца* ***«Крутуха»***; *узорны харавы калектыў* ***«Пралескі»*** (зыходны апелятыў называе прыгожую кветку, што стала ўвасабленнем вясны, надзеі на лепшае) і інш. Да сродкаў беларускай мовы (часам праз транслітарацыю лацінкай) звяртаюцца і калектывы, якія выконваюць так званую альтэрнатыўную музыку: *індзі-рок-група* ***«Zolki band»*** (бел. *золкі* 'сыры'; франтмэн калектыву адзначае, што «чытаецца, як і пішацца, – ЗОЛКІ. Звычайнае беларускае слова зноў жа ў лацінскім напісанні» [21]); *група* ***«Bel;ya»*** (на старонцы творчага аб'яднання ў сацсетцы даецца транскрыпцыя [*белыя*]). Прычын звароту да лацінкі пры стварэнні падобных уласных імёнаў, мяркуем, некалькі (уключанасць калектываў у музычны працэс, у кантэкст не толькі беларускай, але і сусветнай культуры, уплыў «моўнай моды», пэўнае стаўленне імядаўцаў да «be-Latn» і нек. інш.).

Як бачым, адзначаная прадстаўленасць руска- і беларускамоўных найменняў карэлюе з моўнай сітуацыяй на Брэстчыне і ў цэлым у краіне: яна складаная (дзяржаўнае двухмоўе), гамагенная, нераўнаважная, незбалансаваная (у камунікатыўным плане пераважае руская мова). Аднак назіраюцца і станоўчыя моманты: з канца 1990-х гг. захавальнікамі роднай

мовы з’яўляюцца не толькі носьбіты традыцыйнай вясковай культуры, але і прадстаўнікі гарадской інтэлігенцыі, частка адукаванай моладзі [22].

У даследуемым эрганіміконе запатрабаваны таксама іншамоўныя, у першую чаргу англійскія, сродкі: яны і проста запазычваюцца, і выступаюць «цаглінамі» для лінгвакрэацыі імядаўцы: *тэатр танца* ***«Post scriptum»*** (лац. ‘пасля напісанага’; уласнае імя «абяцае» ўспаміны, зварот да ўбачанага і *пасля* выступлення калектыва); *група* ***«Brest Street Boys»*** (правобразам паслужыла намінацыя вядомага бэнда з ЗША *«Backstreet Boys»* (англ. ‘хлопцы з задворкаў’): замена *Back* на сугучны *Brest* стала паказальнікам месца працы творчага аб’яднання) і інш. Падаюцца такія назвы творчых аб’яднанняў па-рознаму – лацінкай або кірыліцай: *вакальнае аб’яднанне* ***«Smile»*** (англ. ‘усмешка’; *смайлам* / *смайлікам* называюць знакі эмоцыі ў сучаснай SMS-, інтэрнэт-камунікацыі); *гурток сучаснага танца* ***«DANSGO»***; *групы* ***«Broken Roads on the West» / «B.R.O.W.»*** (англ. ‘разбітыя дарогі Захаду’; эргонім выклікае асацыяцыі з амерыканскім фільмам «God Bless the *Broken Road*» (2018) і аднайменнай песняй у ім, з камп’ютарнай гульнёй *«Broken Roads»*; але галоўным у назве з’яўляецца адсылка да *заходняй* музыкі, да старога року, якаснае адраджэнне якога праз стварэнне мелодый «з рытмамі эпохі рок-н-ролла» дэкларуе калектыў), ***«AllGoRhythm»*** (капіталізацыя, г.зн. гульня прапіснымі / малымі літарамі, актуалізавала сэнсавы кампанент *рытм*), «***Wolfshade»*** (англ. / нем. *wolf* ‘воўк’, *shade* ‘цень, змрок’; імя запазычана, па ўспамінах лідара калектыву, у партугальскай групы «Moonspell», у рэпертуары якой ёсць «вельмі прыгожая песня» – *«Wolfshade»*; дарэчы, вобразы *ваўка*, *пярэваратня* характэрны для музыкі ў стылі метал), ***«CoverDayzzz»*** (назва ўказвае на сферу інтарэсаў (канцоўка эргоніма нагадвае англ. *jazz* і імітуе гучанне гітары), спецыялізацыю (выконвае *кавер*-версіі) творчага аб’яднання); *група* ***«Own charter»*** (англ. ‘собственный устав’; у назве дамінуюць семы ‘непадобнасць’, ‘індывідуальнасць’); *народны ансамбль эстрадна-спартыўнага танца* ***«Райз»*** (англ. *rise* ‘пад’ём, рост’); *вокальная*

група ***«Солис»*** (лац. *solis* ‘сонечны прамень, сонечнае святло’; *народная вокальная студия* ***«Феличита»*** (італ. *felicita* ‘шчасце’) і інш.

Полікультурнасць, поліэтнічнасць сучаснага свету, глабалізацыю, інтэрналізацыю камунікацыі ў Беларусі дэманструюць і гібрыдныя (спалучаюць сродкі розных моў) эргонімы: *група* ***«Байки.By» / «Байки.BY» / «Байки BY»*** (уласнае імя ўзыходзіць да назвы і брутальнага віду транспарту (*байка*), і фальклорнага жанру: заснавальнік калектыву А. Крываносаў адзначае, што у назве *байки* – гэта казкі, *BY* – беларускі домен, а разам – ‘беларускія казкі’); *народный инструментальный ансамбль* ***«Карусель PLUS»***; *народный ансамбль народных инструментов* ***«ПозитиV»*** (літара *V* пачынае словы лац. *victory*, франц. *victoir* і перадае значэнне ‘перамога’) і інш.

Пашырэнне эрганімікона Брэстчыны адбываецца, як ужо адзначалася вышэй, за кошт транслітараваных беларуска- і рускамоўных адзінак: *група* ***«Onegin»***; *арт-дуэты* ***«Pora po param» / «Пора по парам»***, ***«Vi&Di»*** (імёны музыкантаў рус. *Ви*талий і рус. *Ди*ана); *дуэт* ***«Дикейт» / «Di&Kate»*** (назва калектыву зашыфравала імёны яго ўдзельнікаў: рус. *Ди*ма і *Кейт* / англ. *Kate* ад Кацярына) і інш. На лацінцы падаецца і наступны эргонім-абрэвіятура, які мае рускамоўную матывавальную базу: *група* ***«N.A.B.R» / «NABR»*** («У жніўні група выпусціла поўнафарматны дэбютны альбом “*Наша Автономная Боевая Ракета*”. Пра что спявае NABR? Пра космас і міялафон, дружбу і адзіноцтва. Кажуць, музыка нагадвае па гучанні групы 2000-х, але хіба гэта заўсёды дрэнна? “Спасибо, Юра, космос наш, – спявае Воўка (лідар групы Вова Плюмбум. – *Г. Л.*) у песні-прысвячэнні Гагарыну. – Дела с квартирой обстоят гораздо хуже. Всё, что осталось от большой советской дружбы, надёжно спрятано в гараж”. Ну што тут дабавіш?» [23]).

Розныя праявы іншамоўнасці эргоніма выклікаюць даволі неадназначную ацэнку. З аднаго боку, зварот да сродкаў другіх моўных сістэм дэаўтаматызуе ўспрыманне ўласнага імя, прыцягвае ўвагу, прыдае

модны каларыт, устанаўлівае кантакт з мэтавай аўдыторыяй творчага аб'яднання, павышае яго статус у моўнай супольнасці рэгіёна, краіны (успомнім пра феномен большага даверу да замежнага, чым да свайго, айчыннага) і «служыць перспектывай для выхаду на міжнародны ўзровень, а таксама ў некаторых выпадках палягчае зносіны з заходнімі партнёрамі» [24]. Напрыклад, дзвюма версіямі (на ўзроўні кампанентаў і родавога, і прапрыяльнага) найменне карыстаецца вядомая далёка за мяжой брэсцкая *народная эстрадная группа* ***«Спасение»*** */ band* ***«Spasenie»***. У той жа час графіка-арфаграфічнае двухмоўе, выкарыстоўванне ў пісьмовым тэксце, які прызначаецца для ўспрымання беларуска- / рускамоўным адрасатам, асобных літар замежнага алфавіта, іншамоўных слоў, словазлучэнняў, фраз прыводзіць, па азначэнні Т. В. Шмялёвай, да разбурэння прынцыпу адзінасці пісьменнасці. А ў цэлым празмернае ўжыванне запазычаных элементаў размывае літаратурныя нормы, успрымаецца як засмечванне роднай мовы, нясе ў пэўнай ступені пагрозу яе экалогіі.

Назвы творчых калектываў Брэстчыны адлюстроўваюць розныя **формы існавання** мовы. Найбольшай масавасцю характарызуюцца ўласныя імёны, у якіх выкарыстоўваюцца сродкі літаратурнай беларускай / рускай мовы: *народны клуб нацыянальных культур* ***«Садружнасць»***; *школа танцаў* ***«Зорны клуб»***; *клуб любителей инструментальной музыки* ***«Гармония»*** і інш. Асобна спынімся на эргоніме *група* ***«Сьцяна»***, які падаецца беларускім дарэформенным (1933 г.) правапісам; у наш час правапіс паводле граматыкі Б. Тарашкевіча і беларускамоўныя выданні таго часу сталі фактам культурна-гістарычнай спадчыны.

Нелітаратурныя формы ў коле зафіксаваных назваў творчых калектываў прадстаўлены нешматлікімі дыялектызмамі: а) тэрытарыяльнымі: *клуб аматараў фальклору* ***«Вясковая табала»*** (прывядзем тлумачэнне назвы калектыву, якое дае яго нязменны кіраўнік Г. Хомік і якое яскрава дэманструе моўную рэфлексію імядаўцаў творчых аб'яднанняў: «Слова *табала* я пачула

ўпершыню ў вёсцы Мельнікі. Яго ў сваім маўленні цяпер выкарыстоўваюць і жыхары Хаціслава. *Табала* ў нашым населеным пункце – гэта ‘збор’, ‘гурт дзяцей’. Слова з сакавітым мясцовым каларытам – яркае, гучнае, запамінальнае! Мы падумалі: чаму б не даць клубу аматараў фальклору такую ж назву?» [25]); *клуб аматараў фальклору* ***«Драгабужская багатуха»*** (эргонім уключае мясцовую назву народнага свята *багач*); *народны тэатр народнага гумару* ***«Споражскі акалот»*** (назоўнік мае значэнне ‘сноп пасля абмалоту’, а ў некаторых гаворках, напрыклад в. Альшэва Бярозаўскага раёна, – ‘жыхары вёскі’) і інш.; б) сацыяльнымі: *група* ***«Апарат АбонентА»*** (назва ўзыходзіць да маўленчага звароту, тыповага для камунікацыі спецыялістаў у галіне тэлефаніі; а шэраг лінгвістаў кваліфікуе прафесійную мову як сацыялект). Выклікае цікавасць эргонім *група* ***«Rower»***: формы *ровер*, *ровэр*, *ровар*, *ровыр* ‘веласіпед’ фіксуюцца ў беларускіх гаворках, але ў маўленні гарадскіх жыхароў гэтая лексема ўспрымаецца хутчэй як адзінка слэнгу (моладзевага). Напрыклад, дадзеная назва транспартнага сродку актыўна ўжываецца ў рэкламным дыскурсе (веламайстэрня *«Зялёны ровар»* у Салігорску; веламайстэрня *«Ровар»* у Магілёве; пункт пракату веласіпедаў *«Твой ровар»* у Мінску; інтэрнэт-рэсурс *«Ровар.бай»* і інш.), а прапанаваныя тавары, паслугі арыентуюцца на моладзь, на асоб сучасных, актыўных. Дарэчы, музыканты падкрэсліваюць актуальнасць, інтэрнацыянальнасць, полісемантычнасць свайго наймення. Дадзены прыклад, лічым, удала адлюстроўвае складанне сацыяльных дыялектаў як формы існавання беларускай мовы (да нядаўняга часу яе сацыялекты лічылі толькі гістарычным фактам): у сучаснай Беларусі рэальна функцыянуюць студэнцкі, моладзевы слэнг, у сацыяльных сетках актыўна фарміруецца беларускамоўны камп’ютарны слэнг, развіваецца беларуская мова СМС-, інтэрнэт-, мэсенджар-камунікацыі [26].

Для асэнсавання моўнай сітуацыі важна улічваць **стылёвую разнастайнасць**, якой прадстаўлена беларуская / руская мова ў аналізуемай

эргонімнай падсістэме. У якасці назваў творчых калектываў выступаюць і міжстылёвыя, і стылістычна маркіраваныя моўныя сродкі. Сярод апошніх – рэпрэзентанты практычна ўсіх асноўных функцыянальных стыляў:

а) навуковага – гэта, у прыватнасці, тэрміны з мастацтва-, музыка-, літаратуразнаўства, з камп'ютарных навук, якія могуць пераасэнсоўвацца, пашыраць кола сваіх значэнняў: *народны вакальны ансамбль* ***«Акалада» / «Акколада»***; *кружок игры на гитаре* ***«Адажио»***; *ансамбли* ***«Бельканто»***, ***«Ренессанс»***; *народная арт-группа* ***«Бревис»***; *народный вокально-инструментальный ансамбль* ***«Каприччио»***; *театральная студия* ***«Этюд»***; *инструментальный коллектив* ***«Элегия»*** і інш. Запатрабаваную ў сучаснай камунікацыі моўную гульню дэманструе ўласнае імя *группа* ***«Alt+F4»***: калектыў склаўся, па словах *«альтыстаў»* (у гэтай мянушцы аб'ектывуецца даволі нечаканая сувязь з музыкай, праз тэрмін *альт*), «як каманда, што іграе *альтэрнатыўную* музыку, якую цяжка аднесці да якога-небудзь жанру» – адсюль і назва; камбінацыя клавіш *Alt+F4* на камп'ютары выкарыстоўваецца для *выхаду* з праграм, дадаткаў і г.д., а «ў кантэксце групы – *выхад* за межы стылю або іншага абмежавання, акрамя таго, лічба *4* азначае першапачатковую колькасць удзельнікаў» [27];

б) публіцыстычнага: *народны ансамбль песні* ***«Спадчына»***; *народный клуб ветеранов войны и труда* ***«Подвиг»***; *творческая мастерская* ***«И не порвется нить…»***; *кружок сольного пения* ***«Новое поколение»*** і інш.;

в) мастацкага: *образцовая вокальная студия* ***«Алиса»***; *любительское объединение* (тэатральнае) ***«Зазеркалье»*** (эргонімы нагадваюць пра аповесці Л. Кэрала «Аліса ў краіне цудаў» і «Аліса ў *Залюстроўі*», характарызуюць мастацтва як *цуд, казачны* свет); *комик-группа* ***«Лицедеи»***; *народный молодежный экспериментальный театр* ***«Пигмалион»*** (эргонім адсылае да антычнага міфу і да аднайменнай п'есы Б. Шоу) і інш.;

г) размоўнага: *узорнае фальклорнае аб'яднанне* ***«Белавежская цявінка»*** (матывавальны назоўнік уяўляе сабой памяншальна-ласкальны дэрыват

ад разм. *цявіна* ‘сцябліна травы, травінка’); *узорны ансамбль народнай музыкі* ***«Вячоркі»***; *узорны ансамбль танца* ***«Местачковыя казыры»***; *узорная студыя* ***«Папяровыя дзівосы»***; *народны ансамбль народных інструментаў* ***«Сябрына»***; *образцовая эстрадная студия* ***«Тарарам»***; *вокальная студия* ***«Смайлики»***; *панк-группа* ***«Брови Брежнева»*** (зыходнае спалучэнне слоў у значэнні ‘чорныя густыя бровы’ стала ўжо ўстойлівым, пра што сведчаць і прыклады з інтэрнэт-публікацый: «“*Брови Брежнева*”. Как с ними бороться…»; «Хотите *брови* как у *Брежнева*?» і пад.) і інш.

Эрганімія аб’ектывуе рознабаковую інфармацыю пра ўдзельнікаў творчых аб’яднанняў, іх патэнцыяльных гледачоў / слухачоў і тым самым (у пэўнай ступені апасродкавана) – пра **сацыяльную неаднароднасць** носьбітаў беларускай / рускай мовы. У прыватнасці, зафіксаваныя ўласныя імёны маркіруюць: а) этнічную прыналежнасць: *народны ансамбль народнай музыкі* ***«Славяне»***; *народны ансамбль песні* ***«Славія»*** / ***«Славия»***; *народны ансамбль песні і танца* ***«Сузор’е»***; *народная аматарская студыя* ***«Вясёлкавая плынь»*** **–** таксама на «беларускасць» указвае яшчэ цэлы шэраг эргонімаў на мове тытульнай нацыі (гл. вышэй); *творческий клуб* ***«Светлояр»*** (матывавальны гідронім называе возера, у якім, па легендзе, патануў Кіцеж – месіяністычны горад, своеасаблівы рускі Іерусалім); *ансамбль русской песни* ***«Сударушка»*** (два апошнія аб’яднанні працуюць пры РГА «*Русское* общество» ў г. Бресце); *хор* ***«Polesie»*** (дзейнічае пры грамадскім аб’яднанні «*Polska* Macierz Szkolna»); *ансамбль песни и танца* ***«Каролинка»*** (калектыў не выпадкова з 1989 г. носіць жаночае імя, якое на Брэстчыне ўспрымаецца як польскае, каталіцкае: ён ствараўся як носьбіт польскай культуры, неаднаразова выступаў на сусветных фестывалях паланійных ансамбляў; трэба адзначыць, што ў рэпертуары творчага аб’яднання таксама прадстаўлены танцы жыхароў Беларусі і Украіны, рэгіянальныя «плясы»); *коллектив музыкантов* ***«Pan JAREK & compny»*** (у найменні выкарастоўваецца форма звароту да мужчыны (лідара завуць *Яраслаў* Маеўскі), прынятая ў Заходняй Беларусі,

у першую чаргу – сярод палякаў і / ці каталікоў); *ансамбль* ***«Шошана»*** (калектыў аб’ядноўвае прадстаўнікоў яўрэйскай абшчыны г. Брэста, а эргонім матывуецца жаночым імем, якое ў перакладзе з іўрыта азначае ‘лілія’) і інш.; б) месца пражывання, дзейнасці: *ансамбль* ***«Галасы Палесся» / «Голоса Полесья»***; *народны ансамбль народнай песні* ***«Вяскоўцы»***; *узорны ансамбль лыжачнікаў* ***«Браннагорскія лыжкарыкі»***; *узорны ансамбль гарманістаў* ***«Картузяне»*** (калектыў працуе ў Бярозе, а сярод гістарычных назваў горада фіксуецца і *Куртуз*-Бяроза / Бяроза-*Картузская*, якая звязана з картузіанскім / картэзіанскім манастыром, заснаваным ў XVII ст. Казімірам Львом Сапегам); *клубное формирование* ***«Брестский блюз»***; *народный ансамбль народной песни* ***«Берестье»***; *детский народный ансамбль песни и танца* ***«Прибужье»***; *народный ансамбль джазовой музыки* ***«Буг-бэнд»*** (у оніме, спосаб намінацыі якога можна назваць дэрывацыяй па канкрэтным узоры, адчуваецца матывацыя назвай аднаго з тыпаў джазавага аркестра – *big band* / *биг-бэнд* / *биг-бенд*); в) гендар: *народны фальклорна-этнаграфічны калектыў* ***«Суседкі»***; *народны ансамбль народнай песні* ***«Пескаўскія весялухі» / «Песковские веселухи»***; *узорны хор хлопчыкаў* ***«Пеўнікі»***; *народны ансамбль песні* ***«Чэрнічанка» / «Чарнічанка» / «Черничанка»*** (калектыў з в. *Чэрні*) і інш.; г) узрост: *вокальный кружок* ***«Детское время»***; *кружок сольного пения* ***«Новое поколение»***; *образцовый ансамбль эстрадного танца* ***«Непоседы»***; *арт-группа* ***«Гости из будущего»*** (эргонім характарызуецца прэцэдэнтнасцю і выклікае ўспаміны пра папулярны ў свой час савецкі дзіцячы навукова-фантастычны тэлефільм *«Гостья из будущего»*) і інш.; д) род заняткаў, сферу інтарэсаў: *клуб любителей художественного чтения* ***«Витражи слов»***; *студия-мастерская* ***«Академия ремёсел»***; *ансамбль* ***«Бельканто»*** (італ. *bel canto* ‘прыгожыя спевы’, зыходны музычны тэрмін называе стыль вакальнага выканаанння оперных партый, песень і г.д., які адрозніваецца лёгкасцю, вытанчанасцю, пявучасцю); *група* ***«PARAdiYES»*** (онім уяўляе сабой «матрошку», якая ў выніку графадэрывацыі аб’ектывуе некалькі матывацый,

у т.л. франц. *paradis* (‘рай’) і *пародыя*, – менавіта ў гэтым жанры працуюць артысты) і інш.; е) веравызнанне: *народны мужчынскі вакальны ансамбль* ***«Дабравест» / «Благавест» / «Благовест»***; *детско-юношеский хор* ***«Благовест»*** (калектыў дзейнічае пры Свята-Сімяонаўскім кафедральным саборы ў г. Брэсце); *моладзевы рух* ***«Дзеці Марыі»*** (у яго межах пры каталіцкіх саборах ствараюцца аднайменныя супольнасці) і інш.; ж) духоўныя, матэрыяльныя каштоўнасці, арыенціры: *народны хор ветэранаў* ***«Крыштальныя крыніцы»***; *клуб аматараў фальклору* ***«Жывая вада»***; *народнае аматарскае аб’яднанне ветэранаў* ***«Белая Вежа»*** (аднайменная башня-данжон XIII ст. стала сімвалам г. Камянец); *народный клуб ветеранов войны и труда* ***«Память сердца»*** і інш.

Такім чынам, уласныя імёны творчых аб’яднанняў адлюстроўваюць сацыяльную стратыфікацыю моўнай супольнасці Брэсцкага рэгіёна; дэманструюць зварот (у т.л. з-за этнічнай, канфесійнай прыналежнасці, узросту, гендару, адукацыі, спецыфікі дзейнасці, інтарэсаў, моўнага густу і г.д. імядаўцаў калектываў і іх мэтавай аўдыторыі) да розных моўных стыхій і яшчэ раз пацвярджаюць шматкампанентны характар моўнай сітуацыі ў Беларусі. Таксама эрганімікон рэпрэзентуе некаторыя тэндэнцыі, характэрныя для сучаснага этапу моўнага развіцця: пашырэнне сфер функцыянавання беларускай мовы, ускладненне сістэмы яе падкодаў; глабалізацыю ўсходнеславянскіх моў; пранікненне ў публічную пісьмовую камунікацыю на беларускай / рускай мове элементаў яе вусных разнавіднасцяў.

Літаратура

1. Суперанская, А. В. Общая теория имени собственного / А. В. Суперанская. – М. : Наука, 1973. – С. 36.

2. Новикова, О. Н. Аспекты когнитивного изучения имени собственного – антропонима / О. Н. Новикова // Вопросы когнитивной лингвистики. – 2011. – № 3 (028). – С. 90–93.

3. Голомидова, М. В. Проявление ассоциативного потенциала эргонима в речевой деятельности / М. В. Голомидова // Язык. Система. Личность. – Екатеринбург : УрГПУ, 2000. – С. 32–38.

4. Рудакова, А. В. Специфика психолингвистического описания семантики топонимов / А. В. Рудакова // Вестник ВГУ. Серия: Филология. Журналистика. – 2019. – № 1. – С. 66–70.

5. Шилей, Е. В. Наименование организации как стратегическое сообщение : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.19 / Е. В. Шилей ; Минск. гос. лингв. ун-т. – Минск, 2019. – 23 с.

6. Курбанова, М. Г. Эргонимы современного русского языка: семантика и прагматика : автореф дис. ... канд. филол. наук : 10.02.01 / М. Г. Курбанова ; Волгоград. гос. соц.-пед. ун-т. – Волгоград, 2015. – 23 с.

7. Трифонова, Е. А. Названия деловых объектов : семантика, прагматика, поэтика (на материале русских и английских эргонимов) : дис. ... канд. филол. наук : 10.02.19 / Е. А. Трифонова ; Волгоград. гос. пед. ун-т. – Волгоград, 2006. – 20 с.

8. Шимкевич, Н. В. Русская коммерческая эргонимия: прагматический и лингвокультурологический аспекты : автореф. дис. ... канд. филол. наук :10.02.01 / Н. В. Шимкевич ; Урал. гос. ун-т им. А. М. Горького. – Екатеринбург, 2002. – 22 с.

9. Ражина, В. А. Ономастические реалии : лингвокультурологический и прагматический аспекты : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.19 / В. А. Ражина ; Кубан. гос. ун-т. – Краснодар, 2007. – 19 с.

10. Борисевич, О. А. Экклезионимия Беларуси : структурный, номинативный, лингвогеографический аспекты : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.02 / О. А. Борисевич ; Бел. гос. ун-т – Минск, 2012. – 24 с.

11. Хоанг, Тхи Бен. Национально-культурный аспект проприальной номинации в Беларуси и Вьетнаме (на материале эргонимии г. Минска

и Ханоя) : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.20 / Т. Б. Хоанг ; Бел. гос. ун-т. – Минск, 2017. – 28 с.

12. Васильева, Т. Ю. Реализация персонажного кода культуры в ойконимии Белорусского Поозерья / Т. Ю. Васильева // Ученые записки Витебского гос. ун-та им. П. М. Машерова. – 2012. – Т. 13. – С. 216–226.

13. Дорофеенко, М. Л. Виконимия Беларуси: номинативный, лингвогеографический, лингвокультурологический аспекты : автореф. дис… канд. филол. наук : 10.02.02 / М. Л. Дорофеенко ; Бел. гос. ун-т. – Минск, 2015. – 28 с.

14. Переход, О. Б. Лингвокультурный компонент в периферийном ономастиконе Брестчины (на материале прагматонимов и эргонимов) / О. Б. Переход // Русский и белорусский языки в контексте глобализации : материалы Междунар. науч.-практич. конф., Москва, 30 мая 2019 г. / [редкол. : Н. П. Баранова (отв. ред.) и др.]. – Минск : МГЛУ, 2020. – С. 139–144.

15. Белорусское Поозерье: культура – ономастика – социум : монография / А. М. Мезенко [и др.] ; под науч. ред. А. М. Мезенко. – Витебск : ВГУ имени М. П. Машерова, 2017. – 180 с.

16. Ратникова, И. Э. Имя собственное: от культурной семантики к языковой / И. Э. Ратникова. – Минск : Изд-во БГУ, 2003. – 214 с.

17. Тураева, А. И. Социолингвистический и структурно-семантический аспекты эргонимических комплексов на юге Великобритании и России : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.20 / А. И. Тураева ; Пятигор. гос. лингв. ун-т. – Пятигорск, 2012. – 30 с.

18. Подольская, Н. В. Словарь русской ономастической терминологии / Н. В. Подольская ; отв. ред. А. В. Суперанская. – М. : Наука, 1978. – С. 166.

19. Словарь социолингвистических терминов / Рос. акад. наук ; Ин-т языкознания ; Рос. акад. лингв. наук ; Ин-т иностран. языков ; ред. М. Ю. Михальченко. – М., 2006. – С. 207.

20. Беликов, В. И. Социолингвистика : учебник / В. И. Беликов, Л. П. Крысин. – М. : РГГУ, 2001. – С. 15.

21. Мартынюк, М. «Главное – это само существование возможности публично высказаться для всех и каждого» : интервью с Zolki band [Электронный ресурс] / М. Мартынюк // Natatnik [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://natatnik.by/intervyu-s-zolki-band/. – Дата доступа: 15.01.2021.

22. Лукашанец, А. А. Беларуская мова на пачатку XXI стагоддзя (некаторыя разважанні) / А. А. Лукашанец // Беларуская мова ў XXI стагоддзі: развіццё сістэмы і праблемы функцыянавання / А. А. Лукашанец. – Мінск : Бел. навука, 2014. – С. 11.

23. Гапеева, Т. 5 брестских рок-групп, на которые стоит обратить внимание [Электронный ресурс] / Т. Гапеева // Брестская газета. – Режим доступа: https://www.b-g.by/culture/28733/. – Дата доступа: 08.01.2021.

24. Гусейнова, Н. А. Современная российская эргонимия в аспекте иноязычных заимствований : дис. … канд. филол. наук : 10.02.01 / Н. А. Гусейнова. – М., 2014. – С. 100.

25. Навумчык, М. Што такое «табала?» [Электронный ресурс] / М. Навумчык // Культура. – 16.08.2014–22.08.2014 г. – № 33 (1159) – Режим доступа: http://kimpress.by/index.phtml?page=2&id=10675. – Дата доступа: 08.01.2021.

26. Сучасная беларуская літаратурная мова : вучэб. дапаможнік / Д. В. Дзятко [і інш.] ; пад рэд. Д. В. Дзятко. – Мінск : Вышэйшая школа, 2017. – С. 18.

27. Курашов, Д. ALT+F4 – на «Выход»! [Электронный ресурс] / Д. Курашов // Вечерний Брест. – Режим доступа: https://vb.by/culture/21584.html. – Дата доступа: 10.03.2020.

УДК 811.161.1+811.161.3'373.21

Г а д у й к а Л. А. **Сацыялінгвістычная маркіраванасць эрганіміі (на прыкладзе назваў творчых аб'яднанняў Брэстчыны)** // Беларуская лінгвістыка. 2021. Вып. 87.

В статье современный эргонимикон (на примере отдельного сегмента) рассматривается в социолингвистическом аспекте. Проанализирована объективация в номинациях творческих коллективов таких составляющих языковой ситуации в Беларуси, как используемые социумом языки и их корреляция, как литературная и нелитературные формы существования белорусского и русского языков, их стилевое многообразие. Установлена репрезентация эргонимами неоднородности языкового сообщества. Делается вывод об отражении в названиях творческих коллективов ряда тенденций, характеризующих актуальный этап языкового развития.

Библиогр. – 27 назв.

SUMMARY

In the article, the modern ergonymicon (on the example of a separate segment) is considered in the sociolinguistic aspect. The objectification in the nominations of creative teams of such components of the language situation in Belarus as the languages used by society and their correlation, as literary and non-literary forms of existence of the Belarusian and Russian languages, their stylistic diversity is analyzed. The representation of the heterogeneity of the linguistic community by ergonyms has been established. The conclusion is made about the reflection in the names of creative groups of a number of tendencies that characterize the current stage of language development.

Установа адукацыі

«Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна» *08.08.2021 г.*